# ЗНАЁМСТВА

■ Прафарыентацыйны квест для навучэнцаў старшых класаў правялі ў Полацкім дзяржаўным універсітэце. У цікавай форме — пазнавальных віктарынах, спробах зазірнуць у будучыню і мінулае, экскурсіі па Полацкім калегіўме — моладзь знаёмілася з сучаснымі прафесіямі. Працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі, на кожнай з іх студэнты распавядалі пра факультэты, абраныя спецыяльнасці і свае дасягненні.

Таксама дзейнічалі танцавальная, інтэлектуальная і іншыя пляцоўкі. Фінішыравала мерапрыемства танцавальным флэшмобам.